Тарайкевіч М.Л., магістрант
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Мышкавец А.А.,
канд. пед. навук

# КАЛАЖ ЯК СРОДАК ЗМЯНЕННЯ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ РЭАЛЬНАСЦІ

Калаж – гэта жанр выяўленчага мастацтва, сутнасць якога – у складанні карцінкі, вобраза з фрагментаў іншых твораў мастацтва (выяў, фатаграфій), тэкстаў, markdownрознародных матэрыялаў і прадметаў. У сацыяльна-педагагічным выкарыстанні калажная тэхніка мае шэраг асабліваснкй, такіх як: гарантаванасць поспеху з-за прыгажосці ці рэалізму гатовых вобразаў ці матэрыялаў; своеасаблівы культурніцкі змест, абумоўлены тым, што выявы, матэрыялы і прадметы, якія выкарыстоўваюцца, самі з’яўляюцца сацыякультурнымі артэфактамі; шырокія магчымасці супрацоўніцтва, узаемадапаўнення паміж удзельнікамі працэсу калажнай творчасці; забаўляльнасць методыкі, якая акрамя мастацтва з’яўляецца яшчэ і гульней; і, нарэшце, - своеасаблівы сэнс калажа ў сённяшнюю эпоху постмадэрнізму.

Калаж з сярэдзіны 20 ст. пашырана выкарыстоўваецца як арт-тэрапеўтычная тэхніка. Але ёсць і больш раннія сведчанні пра выкарыстоўванне калажа дзеля перадолення псіхалагічных праблем: мастачка Ф. Дыкер-Брайдэнс выкарыстоўвала яго як тэхніку, калі праводзіла ўрокі выяўленчага мастацтва з дзецьмі ў канцлагеры-размеркавальніку Тэрэзін. З успамінаў яе вучняў, якія выжылі, можна зрабіць выснову, што педагог здолела на сваіх занятках ствараць атмасферу свабоднай творчасці, фантазіі, якая дапамагала дзецям канцэнтравацца на станоўчых перажываннях і такім чынам выжываць не толькі фізічна, але і душэўна, як асоба.

Сацыякультурная рэальнасць, у нашым вызначэнні – гэта сукупнасць чалавечых адносінаў, фенаменаў соцыўма і культуры, а таксама самых розных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыяльных аб’ектаў, якая ўтвараецца ў працэсе існавання чалавечых супольнасцей.

Сацыякультурная прастора – гэта нейкі “кавалак” сацыякультурнай рэальнасці, які ўзнікае на аснове пэўных чалавечых адносінаў, пэўным чынам размяшчаецца ў прасторы і ў часе і характэрызуецца спецыфічнасцю чалавечых адносінаў, а таксама наяўнасцю характэрных аб’ектаў. Выключнае значэнне ў сацыякультурнай прасторы маюць матэрыяльна-культурныя аб’екты. Сярод матэрыяльных аб’ектаў, якія нясуць чалавеку пэўную інфармацыю і выхоўваюць яго, асобнае месца належыць творам выяўленчага мастацтва. Таму калаж мы разглядаем не толькі як жанр выяўленчага мастацтва, але і як сацыяльна-педагагічны інструмент.

Сацыякультурныя прасторы могуць несці вельмі розныя ідэі і каштоўнасці. Так як наш свет недасканалы, то заўсёды ёсць (і часам відавочна рэалізуецца) небяспека дэфармацыі каштоўнасцей, пагрозы псіхалагічнаму і маральнаму здароўю індывідаў і груп. Падобныя пагрозы і дэфармацыі могуць набываць вялікія маштабы, рэалізуючыся ў , сацыякультурных прасторах такіх памераў, як, да прыкладу, нацыстская Германія ці Савецкі Саюз у 30-я гг. Таксама часта дэструктыўныя тэндэнцыі адчуваюцца на ўзроўні такіх сацыякультурных прастор, як школа, арганізацыя, сям’я і інш.

Што трэба рабіць, калі назіраюцца тэндэнцыі, якія пагражаюць развіццю і самарэалізацыі асобы? Адзін са спосабаў дзеяння - арганізаваць нейкі кавалачак прасторы так, каб стварылася альтэрнатыўная прастора, у якой рэалізуюцца станоўчыя каштоўнасці і пазітыўныя эмоцыі, - з тым, каб гэта давала чалавеку пэўны вопыт, было той “ніткай”, якая выцягвае з нездаровай атмасферы.

Для культуры постмадэрнізму часта характэрна ўспрыняцце ўсёй навакольнай рэчаіснасці як калажу. Мы жывем у эпоху рэкламы, НЛП-тэхналогій і СМІ. Для чалавека важна не згубіць сабе, сваю цэласнасць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аўтэнтычнасць і маральнасць у гэтым постмадэрнісцкім “кактэйле”. І мы мяркуем што у гэтым можа быць дапамагчы и калаж, - як мастацтва, арыентаванае не толькі на неабмежаваную гульню з вобразамі і сэнсамі, але і на збіранне цэлага з кавалкаў, на выбудоўванне гармоніі і знаходжанне сэнсу. Што ж датычыцца гульнёвасці методыкі, яе здольнасці вызваляць фантазію чалавека, - гэта таксама актуальна ў сённяшнюю эпоху, калі побач са Сцыллай постмадэрнісцкага хаосу ўсё больш паўстае Харыбда фармалізму ў афіцыйным мэйнстрыме і афіцыйнага ўціску. У такіх умовах зусім не перашкодзіць спрычыніцца да псіхалагічнага вызвалення чалавека ад пэўных рамак і стэрэатыпаў.

Мы выкарыстоўвалі калажныя тэхнікі ў працы з дзецьмі ў школе-інтэрнаце № 3 г. Мінска. Мы імкнуліся стварыць прастору, альтэрнатыўную да той, якая атачае выхаванцаў інтэрната ў паўсядзённасці, - з тым, каб досведг свабоднай творчай самарэалізацыі і пазітыўнай камунікацыі яны маглі перанесці ў іншыя сферы жыцця. Гурток працаваў штотыдзень. Частка наведвальнікаў гуртка ходзіць на заняткі рэгулярна; іншая частка – эпізадычна. У такой сітуацыі мы арыентуемся на пастулаты Е. Бурна пра кароткатэрміновую арт-тэрапію і імкнемся выбудоўваць заняткі так, каб нават аднаразовае наведванне давала пазітыўны досвед. У працэсе набыцця вопыту мы прыйшлі да высновы, што варта даваць не тэму, а тэхніку, - г.зн., трэба пазбягаць зададзенасці; трэба даваць прастору, накірунак для творчага развіцця, які забяспечваецца нейкай ідэяй ці тэхнікай. А тэмы, вобразы ў ходзе работы ўзнікаюць самі, - і мы іх прагаворваем, шукаем азначэнні і сэнсы; у выпадку дэструктыўных вобразаў і тэндэнцый – шукаем канструктыўнае выйсце з сітуацый, шукаем магчымасці трансфармацыі. Мы знаходзімся ў працэсе дыягностыкі творчых здольнасцей з дапамогай праектыўных методык і распрацоўкі аўтарскай методыкі “Аналіз сэнсавых планаў”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як мы ўжо адзначылі, мэта нашых намаганняў – стварэнне прасторы высокай культуры камунікацыі, псіхалагічнай бяспекі, душэўнага камфорту, - прасторы, дзе чалавек можа бяз боязі творча выражаць сабе. У дасягненні акрэсленай мэты мы пайшлі яшчэ далей, распрацоўваючы "вулічны калаж", фонам для якога з'яўляецца сам горад, - яго сцены, слупы, агароджы, масты і г.д. Такім спосабам мы намагаемся ўздзейнічаць на людзей альтэрнатыўным метадам, абуджаючы пачуццё свабоды, вызваленне ад звыклых рамак. Такім чынам мы спрабавалі актуалізаваць патрыятычныя пачуцці і нацыянальныя каштоўнасці, - тым больш што апошнім зараз не надаецца належнай увагі ў афіцыйным дыскурсе. Мы аформілі своеасаблівую этыку, якая дазваляе расклейваць свае элементы збольшага такім чынам, каб не псаваць дызайн горада і паважаць працу работнікаў жэсаў. Што ж датычыцца заканадаўчых аспектаў, то тут ёсць падставы для лаббіравання паправак у артыкул 14.26, які датычыцца праблем забруджвання гораду. Напрыклад, магчымы законапраэкт, згодна з якім той, хто хоча расклеіць пэўныя матэрыялы (якія, вядома, не змяшчаюць прызыву да гвалту і нянавісці, агрэсіўных дзеянняў), паведамляе пра гэта міліцыі і потым расклейвае, - а праз месяц абавязаны сам ўсё гэта ўбраць.

Другая праблема, якой мы займаемся выкарыстоўваючы творчыя тэхнікі, - гэта праблема абортаў. Праз афармленне ўлётак, брашур, буклетаў (а афармленне падобных выданняў – гэта заўсёды ў той ці іншай ступені калаж), мы спрабуем данесці інфармацыю пра тое, што дзіця ва ўлонні маці – гэта з пункту гледжання навукі і рэлігіі паўнавартасны чалавечы індывід. Для размяшчэння падобнай інфармацыі мы выкарыстоўвалі і прастору горада.

Такім чынам, мы практыкуем калаж як сродак псіхалагічнага вызвалення чалавека праз творчасць і свабоднага перажывання маральных, духоўных і эстэтычных каштоўнасцей, - чаго мы імкнемся дасягнуць праз розныя формы калажнай творчасці. Мы падазраваем, што наша праца – гэта, вобразна кажучы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кропля ў моры. Аднак мы ўсё адно лічым, што ёсць мастацкі, педагагічны і грамадскі сэнс у тым, каб кінуць у мора соцыўму гэткую “кроплю”, - у таемным спадзяванні, што гэта кропля ў далейшым спрычыніцца да нейкай добрай “ланцуговай рэакцыі”.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Арт-терапия в эпоху постмодерна / Под ред. А.И. Копытина. – СПб.: Изд-во «Речь», 2002. – 224 с.

2. Макарова, Е. Фридл. Документальный роман. – Дружба народов, № 9, 2000.

3. Франкл В. Человек в поисках смысла. М.: Прогресс, 1990.

Бурно М. Е. (1990) Однократное целебно-творческое воздействие. Первая региональная научно-практическая конференция “Актуальные вопросы психотерапии и народной медицины”. Одесса: Одесская областная ассоциация психотерапевтов. С. 96-97.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ